# ПАРВАЦЬ СТЭРЭАТЫПЫ

*«Наступны прыпынак — Каменная Горка», — абвяшчае ў тралейбусе голас з механічнымі ноткамі. Адна з пасажырак, сярэдніх гадоў жанчына з дачкой-падлеткам, тут жа рэагуе і строга гаворыць дзяўчынцы: «Сядай бліжэй, а то зараз набягуць гэтыя... з Каменнай Горкі шматдзетныя...» І не зразумець, што яна хацела выказаць гэтай рэплікай: ці то гонар за сваё «адказнае бацькоўства», ці то пагарду да «шматдзетнай галечы», ці і тое, і другое, і яшчэ нейкі падтэкст?*

*Мабыць, у кожным горадзе і нават вялікай вёсцы ёсць раёны са сваёй канкрэтнай характарыстыкай: «новы» або «стары», «пенсіянерскі» або «студэнцкі», «рабочы», «ваенны», «цыганскі» і г. д. У Мінску, дзе ў межах МКАД жыве і працуе амаль чвэрць краіны, такіх пунктаў мноства. Адзін з іх — болевы — у новабудоўлях вялікага раёна Каменная Горка (а разам з ім Дамброўкі і Масюкоўшчыны), дзе горад імкліва вырас у тым ліку за кошт маладых сем'яў, якія «панапрыязджалі» і «панараджалі». Прычым у камунальна-бытавых размовах, як правіла, большасць сталічных жыхароў (карэнных, так бы мовіць) ставіць знак роўнасці паміж шматдзетнымі сем'ямі і прагай «жыцця на халяву», сацыяльна небяспечным становішчам, крымінальнай напружанасцю і іншымі заганамі, з якімі ў прыстойным грамадстве змагаюцца.*

*Я не буду абурана даводзіць, што гэтыя ярлыкі не маюць пад сабой падставы. Як у кожным маладым раёне (а жыллёвым забудовам Каменнай Горкі ўсяго ад 10 гадоў і менш), дзясяткі тысяч людзей — гэта не адзін дружны вулей, а вельмі разнастайная і няўстойлівая маса. Пакуль адны тутэйшыя бацькі да Дня маці атрымліваюць узнагароды за нараджэнне і выхаванне дзяцей, іншыя насамрэч перыядычна трапляюць у зводкі крымінальных здарэнняў, што правакуе чарговую хвалю інтэрнэт-каментарыяў накшталт: «А, зноў Каменная Горка, маргіналы і шматдзетныя — усё зразумела!»*

*Але хапае і адваротных прыкладаў, якія не дазваляюць заявіць, што, маўляў, там усе на адзін капыл. Напрыклад, у адным з кварталаў Каменнай Горкі таварыства ўласнікаў зладзіла вядомы на ўвесь Мінск «двор без машын» — уявіце сабе, ужо некалькі гадоў тут спакойна гуляюць людзі ўсіх узростаў, а машыны заязджаюць хіба для разгрузкі, і следам падобны вопыт пераймалі ў некалькіх іншых сталічных раёнах. Альбо ўзяць фестывалі, сямейныя і музычныя, якія рэгулярна ладзяць для сябе і суседзяў па раёне прыхаджане мясцовага прыхода Мікалая Японскага — як аказалася, калі ўзяцца з душой, можна і з раённай адміністрацыяй дамовіцца, і нават артыстаў Вялікага тэатра Беларусі запрасіць...*

*І ўсё ж справа ў тым, што дрэннае запамінаецца лепш — гэта агульны закон чалавечай псіхікі. Як жартавалі ў КВЗ, дастаткова аднаго п'янага турыста ў самалёце, каб зрабіць незабыўным водпуск дзясяткаў чалавек. У нашай сітуацыі хопіць двух-трох выпадкаў — у школе або садку, у паліклініцы, на прыёме ў раённай адміністрацыі ці проста ва ўласным двары — хамавата-агрэсіўных ці не вельмі адэкватных паводзінаў вялікай сям'і, каб склалася негатыўнае ўражанне пра шматдзетных. Каб разбурыць яго, спатрэбіцца не адно асабістае знаёмства са шчаслівымі, моцнымі сем'ямі. Альбо асабісты вопыт — калі ўсведамляеш, што сам не ідэальны, але стараешся і дзяцей вучыш жыць па-чалавечы, няяк лягчэй становіцца не прымаць на веру стэрэатыпы, здымаць белае паліто асуджэння і ўключаць эмпатыю.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


# Сямейная газета

Выпуск № 12 (127)


«Зорны» кашалёк

Анатоль ЯРМОЛЕНКА:

# «НЕ БУДУ ЗБІРАЦЬ ГРОШЫ НА «ЧОРНЫ ДЗЕНЬ»

## Лідар «Сяброў» расказаў, на што трацiць ганарары за канцэрты



Анатоль Ярмоленка з дачкой і сынам.

**Абывацелю часам здаецца, што артысты грабуць грошы лапатай і трацяць іх выключна на гламурнае жыццё. А як на самай справе? Пра даходы і выдаткі, сваё стаўленне да грошай расказаў заснавальнік і мастацкі кіраўнік ансамбля «Сябры», народны артыст Беларусі, ганаровы грамадзянін горада Мінска Анатоль Ярмоленка.**

**— Анатоль Іванавіч, кар'ера многіх вашых калег пачыналася з работы ў рэстаранах, на вяселлях, і гэта было добрай выканальніцкай школай і нядрэнным заробкам. А ў вас быў такі перыяд?**

—Я адразу трапіў на прафесійную сцэну. Вайсковую службу праходзіў у ансамблі песні і танца Дома афіцэраў Бакінскай ваеннай акругі супрацьпаветранай абароны. Там жа ў гэты час працаваў вольнанаёмным Муслім Магамаеў. Ён часта прыходзіў на рэпетыцыі разам з кампазітарам Паладам Бюль-Бюль Аглы. Яны ўжо былі папулярнымі музыкантамі, а нам, салдатам, было цікава назіраць за імі, набірацца сцэнічнага вопыту. Аднойчы на гастролі ў Баку прыехаў гомельскі эстрадны калектыў з двума Аляксандрамі — Буйновым і Градскім. Апошні проста з гастрольнага маршруту ад'язджаў паступаць у Гнесінку, таму вызвалялася пасада саліста — тады гастролі доўжыліся тры-чатыры месяцы. Нядзіўна, што разам з калектывам прыехаў і дырэктар Гомельскай філармоніі Андрэй Бабылькоў. Ён і даведаўся, што ў нашым ансамблі ёсць «салдацік, які добра спявае». Так што дэмбель у мяне атрымаўся трохі датэрміновы, але заўважу, што тады якраз скарачалі тэрмін службы з трох гадоў да двух. Так я замяніў у ансамблі Аляксандра Градскага, а потым 21 год адпрацаваў у Гомельскай філармоніі.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Ракурс

# Заплаціце жанчыне больш — і атрымаеце багатую краіну

**Ці ведаеце вы, што ў Беларусі колькасць адукаваных жанчын перавышае колькасць адукаваных мужчын, што першыя часцей падпрацоўваюць дадаткова, і пры гэтым іх сярэдні заробак амаль на траціну меншы? Апроч пералічанага, і гэта, напэўна, самае галоўнае, пасля работы — дома, бясплатна — жанчыны працуюць удвая больш за мужчын.**

### «ХОЦЬ БЫ АДНАГО ВЫРАСЦІЦЬ»

Такім чынам, жанчына ў нашым грамадстве — ламавік. Яна цягне сям'ю і



работу, атрымлівае меншыя заробкі, пры гэтым радзей прызначаецца на кіруючыя пасады або валодае бізнесам. А ўзнагародай ёй — больш доўгае, але адзінокае і небагатае жыццё з абавязковымі выдаткамі на лекі. Бо мужчыны жывуць на 10 гадоў менш, хоць і адчуваюць сябе больш здаровымі. Моладзі (12 % насельніцтва) ў нас таксама недастаткова, каб чакаць забяспечанай старасці — шмат дзяцей не нараджаеш у такіх умовах, бо проста не выцягнеш. На ахвяравальнасці далёка не паедзеш. Таму на другое дзіця ў нас рашаюцца нямногія, а на трэцяе — адзінкі. Вось такая атрымліваецца карцінка. І ў ёй хаваецца сакрэт нашай агульнай, скажам мякка, небагатасці. Так, сацыёлагі і спецыялісты па гендарных пытаннях сцвярджаюць: калі б жанчыны атрымлівалі больш, то краіна ў цэлым стала б багацейшая.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*